

# КАРДОВІЧ
# ІОСІФ МІТРАФАНАВІЧ

Арганізатар партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны,
дзяржаўны дзеяч БССР

Нарадзіўся 5 красавіка 1899 года ў в. Друцк Талачынскага раёна.

У 1919–1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі радавым 29-й Сібірскай стралковай дывізіі. З 1925 года на савецкай рабоце ў Талачынскім, Дубровенскім, Лельчыцкім, Мсціслаўскім, Горацкім раёнах. Член КПСС з 1928 года. З 1939 года – намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

У ліпені 1941 года ўдзельнічаў у абароне Магілёва, член абласнога штаба народнага апалчэння. У 1942 годзе накіраваны ЦК КП(б) у Магілёўскую вобласць для кіраўніцтва партызанскім рухам; са жніўня – сакратар падпольнага Бабруйскага міжраённага камітэта КП(б)Б; з кастрычніка – упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці. Член Магілёўскага падпольнага абкама КП(б)Б з красавіка 1943 года. У тым жа годзе Кардовічу І.М. прысвоенна званне генерал-маёра.

У 1943–1953 гг. – старшыня Магілёўскага, Віцебскага аблвыканкамаў. З 1953 года – член калегіі Міністэрства харчовых тавараў, намеснік міністра прамысловасці мясных і малочных прадуктаў БССР. Кандыдат у члены ЦК з 1949 года, член ЦК КПБ у 1952–1954 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1946–1954), Вярхоўнага Савета БССР (1951–1955).

Узнагароды: медалі “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.” (1945); “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.” (1945); ордэн Чырвонага Сцяга (1943); ордэн Леніна (1945); ордэн Айчыннай вайны II ступені (1945); ордэн Айчыннай вайны I ступені (1943).

Памёр 27 снежня 1967 года. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## Крыніцы інфармацыі:


1. **Иосиф Митрофанович Кардович** // Высшее партизанское командование Белоруссии, 1941–1944 : справочник / Э. Г. Иоффе [и др.] ; под общ. ред. Э. Г. Иоффе. – Минск : Беларусь, 2009. – С. 66–67.

2. **Іосіф Мітрафанавіч Кардовіч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. – С. 643.

3. **Кардович Иосиф Митрофанович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 1. – С. 479.

4. **Кардович Иосиф Митрофанович** // Память народа : Подлинные документы о Второй Мировой... : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : pamyat-naroda.ru.

5. **Кардович Иосиф Митрофанович** // Энциклопедия Бобруйска : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : wiki.bobr.by›Кардович,_Иосиф_Митрофанович.